**Вольга Какшынская**



Галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

**Наталля Карнейчук**



Вядучы бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# У цэнтры ўвагі – пераможцы XXVIII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

14 мая 2020 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў анлайн-рэжыме былі падведзены вынікі XXVIII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2019 г.

У склад кампетэнтнага журы традыцыйна ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк г. Мінска, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры».

У конкурсе прынялі ўдзел 35 публічных бібліятэк: 14 цэнтральных і 21 бібліятэка-філіял, у тым ліку 3 дзіцячыя бібліятэкі, 15 гарпасялковых і сельскіх. З дапамогай «воблачных» тэхналогій усе члены журы атрымалі магчымасць азнаёміцца з дасланымі матэрыяламі напярэдадні пасяджэння.

Вызначэнне пераможцаў адбывалася з дапамогай пісьмовага галасавання. Кожнаму члену журы неабходна было запоўніць ліст апытання і вызначыць пераможцаў сярод бібліятэк, размешчаных у горадзе, і бібліятэк, размешчаных у пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах, адзначыць бібліятэкі да заахвочвання. У мэтах атрымання аб'ектыўнай адзнакі члены журы не ацэньвалі матэрыялы сваёй вобласці.

Напярэдадні пасяджэння ўсе члены журы атрымалі лісты для галасавання, у якіх былі пералічаны работы чатырох намінацый. Яны адзначылі месца, якое неабходна прысудзіць вылучанай ім рабоце, а таксама выказалі свае прапановы аб заахвочванні. Каб атрымаць найбольш аб'ектыўную адзнаку і ўлічыць усе выбары, зробленыя членамі журы, кожнаму выбару было прысвоена пэўнае значэнне: «заахвоціць» – 1, «3 месца» – 2, «2 месца» – 3, «1 месца» – 4. Выбар пераможцаў вызначаўся праз вылічэнне сярэдніх балаў.

Напрыклад, у намінацыі прадстаўлены чатыры бібліятэкі.

За бібліятэку **А** прагаласавалі сем членаў журы. Тры з іх прысвоілі першае месца, два – другое, адзін – трэцяе і адзін – заахвочванне. Агульная колькасць балаў, набраных канкурсантам, складае 3х4 + 2х3 + 1х2 + 1х1 = 21 бал. Сярэдні бал складае 21/15 = 1,4.

Работы, што атрымалі найбольшы сярэдні бал, былі прапанаваны да ўзнагароджання.

Увогуле члены журы адзначылі высокі ўзровень конкурсных работ усіх удзельнікаў, іх арыгінальнасць і якаснае выкананне. Практычна кожная з іх змяшчала ўласныя распрацоўкі, рэкламную і інфармацыйную прадукцыю; суправаджалася электроннымі прэзентацыямі, відэаматэрыяламі, гульнёвымі праграмамі, сцэнарыямі і г. д.

Па выніках конкурсу дыпломамі I, II і III ступеняў былі адзначаны 22 публічныя бібліятэкі, 10 бібліятэк прадстаўлены да заахвочвання. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №___ ад __ чэрвеня 2020 г. «Аб выніках XXVIII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Бібліятэкі-дыпламанты I, II і III ступеней атрымаюць грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна; бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, да 10 базавых велічынь.

Паведамім пра асноўныя дасягненні бібліятэк-пераможцаў, якія атрымалі дыпломы I ступені ў кожнай намінацыі.

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена ў намінацыі «**За пошукавую і даследчую працу**» – 11 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла *Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»* за значную пошукавую і даследчую працу па вывучэнні аб'ектаў манументальнай скульптуры, знаёмства з

лёсам людзей, падзеямі, якія ўвекавечаны ў помніках, мемарыяльных дошках і знаках. Вынікам гэтай працы стала выданне біябібліяграфічнага даведніка «Памяць горада Гродна ў манументальнай скульптуры» і адкрыццё для аддаленых карыстальнікаў электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Манументальная памяць горада Гродна». Рэсурс складаецца з некалькіх раздзелаў і змяшчае google-карту манументальнай скульптуры ў г. Гродна; табліцу з характарыстыкай 150 аб'ектаў манументальнай скульптуры г. Гродна; біяграфіі і фота асоб, якім устаноўлены помнікі, мемарыяльныя дошкі, знакі, пліты і бібліяграфію інфармацыйных крыніц; фота помнікаў, мемарыяльных дошак, пліт, знакаў. Рэсурс паспеў трывала «прапісацца» ў прасторы Інтэрнэту. Банеры (спасылкі) на яго размешчаны на сайтах Гродзенскага гарвыканкама, Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна, навуковай бібліятэкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Казлоўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Светлагорская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці* за рэалізацыю 12 краязнаўчых праектаў, скіраваных на далучэнне дзяцей і падлеткаў да памяці продкаў, багатай і цікавай гісторыі сваёй мясцовасці. Найбольш значныя з іх: брэнд-праект «Музей малой радзімы як увасабленне памяці пакаленняў», сацыяльны праект «Парк памяці», патрыятычны праект «#НіколіЗноў», даследчыцкі праект «Зніклыя, але не забытыя», краязнаўчы праект «10 імён Казлоўкі», культурна-пазнавальны праект «Казлоўка. Кропка на карце» і г. д. Вынікам пошукава-даследчай працы бібліятэкі стала адкрыццё музея малой радзімы і помніка парычанам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; выданне кніг «Блізкае далёкае: гісторыя населеных пунктаў Парыцкага сельскага савета» і «Чырвонай кнігі Светлагорскага раёна»; стварэнне 10 уласных электронных рэсурсаў.

У намінацыю **«За падтрымку і развіццё чытання»** было прадстаўлена 9 работ.

Дыпломам І ступені сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначана *дзяржаўная установа культуры «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы» Мінскай вобласці* за сістэматычную і мэтанакіраваную працу па далучэнні дзяцей і бацькоў да чытання і рэгулярнага наведвання бібліятэкі, прасоўванне лепшых узораў літаратуры ў сферу дзіцячага чытання, адраджэнне традыцый сямейнага чытання праз стварэнне адзінай сістэмы працы паміж установамі дашкольнай адукацыі, бібліятэкай і сям'ёй, рэалізацыю культурна-асветніцкага праекта «Бібліякроха» (2017–2019). У рамках праекта распрацавана сістэма мерапрыемстваў для дзяцей-дашкольнікаў, якія падтрымліваюць і развіваюць цікавасць да кнігі, чытання і бібліятэкі праз гульню. Кожны занятак у абавязковым парадку прадугледжваў гучныя чытанні кнігі, абмеркаванне мастацкага твора, а таксама падрыхтоўку інсцэніроўкі эпізоду з твора, выкананне творчага задання, знаёмства з творчасцю пісьменніка, розныя віктарыны і конкурсы. У выніку рэалізацыі праекта «Бібліякроха» павялічылася колькасць чытачоў дашкольнага ўзросту ў бібліятэцы і цікавасць да кнігі і чытання. Працу над праектам бібліятэкары працягваюць і ў 2020 г.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана *Баранавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Чачота дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці* за фарміраванне актыўнага мясцовага культурнага асяроддзя і стварэнне лічбавай медыяпрасторы праз рэалізацыю бібліятэчных праектаў «Вяртаем вялікія імёны» (2018–2019) і «Адкрываем новыя імёны» (2018–2019). У рамках праектаў бібліятэкары актыўна прапагандавалі жыццё і творчасць класіка беларуска-польскай літаратуры Адама Міцкевіча і знаёмілі з творчасцю сучасных беларускіх аўтараў, у тым ліку аўтараў Баранавіцкага рэгіёна. Найбольш папулярныя формы бібліятэчных мерапрыемстваў, рэалізаваных у рамках праектаў, – творчыя конкурсы, кніжныя выставы, свята кнігі, краязнаўчыя сустрэчы, літаратурныя партрэты, літаратурна-музычныя праграмы і інш. Вынікам гэтай справы стала стварэнне базы даных «Адам Міцкевіч», літаратурнага аб'яднання аўтараў Баранавіцкага раёна «С.Т.Р.О.К.І.»; выданне зборніка твораў да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча, кніг паэзіі мясцовых аўтараў; распрацоўка турыстычнага маршрута «Па сцяжынках спадчыны».

У намінацыю **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** бібліятэкамі былі дасланы 8 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці* за актыўную працу па ваенна-патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў пасродкам кнігі і бібліятэчных праектаў. Бібліятэкарамі была распрацавана мэтавая праграма для дзяцей і падлеткаў «Белорусские версты победы. Лиозненская строка» (2018–2019), якая складаецца з двух праектаў: «Октябрь. Лиозно. 43-й» (да 75-годдзя вызвалення Лёзна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў) і «Победные вёрсты войны. "Багратион"» (да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў). У межах праектаў ладзіліся масавыя мерапрыемствы, ажыццяўлялася пошукава-даследчая і краязнаўчая дзейнасць. Падчас рэалізацыі мэтавай праграмы фонды бібліятэкі папоўніліся новымі выданнямі ваенна-гістарычнай тэматыкі, а яе карыстальнікі прынялі ўдзел у шэрагу творчых бібліятэчных акцый і праектаў.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Сельская бібліятэка аграгарадка Кальчуны дзяржаўнай установы культуры «Ашмянская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за далучэнне падрастаючага пакалення да чытання і кнігі, а праз іх – да вытокаў нацыянальнай культуры і літаратуры. Умела выкарыстоўваючы розныя формы, метады і сродкі работы бібліятэкар стварае спрыяльныя ўмовы для захавання і адраджэння нацыянальных культурных здабыткаў, гістарычнай спадчыны; выхоўвае ў падрастаючага пакалення павагу і гонар за Радзіму; прывівае беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя, патрэбу ў вядзенні здаровага ладу жыцця. Паспяхова бібліятэка рэалізуе праграму «Твары дабро разам з намі» і праект «Старонкі мужнасці і гераізму». У працэсе дзейнасці над праграмай і праектам пры бібліятэцы ўзнікла і дзейнічае валанцёрская група, створаны альбом

«След вайны ў гісторыі маёй сям'і». Сёння вядзецца работа над стварэннем электроннага аднайменнага рэсурсу.

У намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** на разгляд журы было прадстаўлена 7 работ.

На першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк намінавана *дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы» Брэсцкай вобласці* за крэатыўны падыход да папулярызацыі здабыткаў нацыянальнай літаратуры з дапамогай інфаграфікі, арганізацыю гарадскога конкурсу сярод бібліятэкараў «Папулярызацыя беларускай кнігі і чытання сродкамі інфаграфікі», стымуляванне бібліятэчных спецыялістаў да павышэння прафесійнай кампетэнцыі. Стварэнню практычных распрацовак па папулярызацыі беларускай кнігі і чытання ў фармаце інфаграфікі папярэднічаў комплекс падрыхтоўчых мерапрыемстваў: кансультацыя «Інфаграфіка: сучасны від падачы», агляд электронных сэрвісаў, практычныя заняткі для бібліятэкараў «Создание инфографики на сайте Canva.com и использование ее в библиотечной практике», распрацоўка і выданне буклета «Web-мастерская “Сервисы для создания инфографики”». Удзел у конкурсе даў магчымасць бібліятэкарам рознай кваліфікацыі ўключыцца ў актыўную інавацыйную дзейнасць, найбольш поўна здзейсніць асабісты падыход да свайго прафесійнага росту.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, першае месца заняла *Поразаўская бібліятэка-цэнтр краязнаўства дзяржаўнай установы культуры «Свіслацкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за адраджэнне ганчарства, далучэнне дзяцей і падлеткаў г. п. Поразава да культурных каштоўнасцей, рэалізацыю праекта па адкрыцці на базе бібліятэкі музейнага пакоя «Мастацтва гліны і агню», праекта па далейшым развіцці музейнага пакоя «Адроджанае рамяство», на рэалізацыю якога бібліятэкай у 2019 г. атрыманы грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Упершыню на базе бібліятэкі вядзецца навучанне ганчарнаму рамяству ў форме групавых тэарэтычных і індывідуальных практычных заняткаў. У рамках праекта «Адроджанае рамяство» створана і працуе аматарскае аб'яднанне «Спадчына» для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. Для турыстаў бібліятэкарамі распрацаваны пазнавальны тур «Поразаўская чорназадымленая кераміка».

Конкурс завершаны, вынікі падведзены і пачынаецца адлік часу для рэалізацыі бібліятэкамі новых задумак і планаў. Прыемна тое, што прадстаўленыя на конкурс матэрыялы выразна адлюстроўваюць, як рэалізоўваецца патэнцыял работы бібліятэк у справе адраджэння нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збірання і распаўсюджвання фалькорна-этнаграфічнай спадчыны. І сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што значную ролю ў гэтым адыгрывае рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

**Summary**

The article summarizes the XXVIII Republican contest “Library – the center of national culture”.